# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

15 лютага 2017 г.
№ 5 (389)




стар. 3

**Дарогі расчысцілі за два дні**




стар. 6

**Хто ўдыхне жыццё ў «мёртвыя» аб'екты?**




стар. 8

**Эксперыментуем... дзеля ўстойлівага развіцця**

ДЭКРЭТ №3

# КАГО ЛІЧЫЦЬ УТРЫМАНЦАМ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота мае ілюстрацыйны характар.

## Карэспандэнт «МС» высвятляла, каго ў Магілёве вызваляюць ад падатку на ўтрыманства

**Да 20 лютага грамадзяне, якія пазалетась адпрацавалі меней за 183 дні, павінны кампенсаваць дзяржаве фінансавыя выдаткі. Гэта дата агаворваецца ў змяненнях да Дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», якія ўступілі ў дзеянне сёлета 12 студзеня. Па некаторых даных, толькі ў Магілёве каля 20 тысяч чалавек атрымалі «лісты шчасця». Яны павінны будуць раскашэліцца на 360 новых рублёў. Ігнараваць закон і рабіць выгляд, што гэта паведамленне не дайшло, сабе даражэй. Бо справа будзе перададзена ў суд і можа абярнуцца штрафам ад 2 да 4 базавых велічынь або наогул арыштам на 15 сутак.**

### ЗАЛОЖНІКІ ЖЫЦЦЁВЫХ АБСТАВІН

Заканчэнне адтэрміноўкі па 2015 годзе прымусіла грамадзян актывізавацца. Усяго ж за перыяд дзеяння дэкрэта ў Магілёўскі гарвыканкам паступіла 667 зваротаў з заявай вызваліць ад збору. З іх на 8 лютага 537 было ўжо разгледжана.

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# Старое жыццё сучаснай вёскі

## Ці выйсце — праводзіць аптымізацыю за кошт патрэб сельскага насельніцтва?

Такі выгляд Мажэйкаўская сярэдняя школа набыла падчас ажыццяўлення дзяржаўнай праграмы па адраджэнні сяла.



**Я і сёння помню тыя радасныя пачуцці, калі мая родная вёска, што на Лідчыне, трапіла ў дзяржаўную праграму па стварэнні аграгарадкоў. У кароткі час у Мажэйкаве вырасла некалькі шматпавярховікаў, з'явілася сучасная амбулаторыя, адчыніліся аптэкі, камбінат бытавых паслуг, перажыў рэканструкцыю дзіцячы садок, сельскі клуб ператварыўся ў Дом культуры, асартымент у вясковых крамах не саступаў гарадскім універмагам...**

А самае галоўнае, поўнасцю змянілася школа. У яе рэканструкцыі прымалі ўдзел ці не ўсе сельчане. Мы, тады падлеткі, так хацелі першага верасня сесці за новыя парты, што нават на канікулах разграбалі смецце, садзілі клумбы, мылі вокны... І літаральна за тры месяцы, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, у нас з'явілася абсалютна новая школа, дзе не было нават ніводнага старога крэсла. Як цяпер помню, калі на наступнае лета ў школе сустракалі кітайскую дэлегацыю, нам сказалі, што такімі ўмовамі мажа пахваліцца не кожная сталічная гімназія.

Мясцовыя жыхары не маглі нарадавацца. Каб набыць неабходную рэч або скарыстацца той ці іншай паслугай, ужо не трэба было ехаць у горад. Пабудаванае жыллё, створаныя працоўныя месцы, а таксама развітая інфраструктура прывабілі і гараджан, якія даўно марылі пераехаць у вёску. У Мажэйкаве з задавальненнем заставаліся пасля размеркавання маладыя спецыялісты. Адным словам, стаўшы аграгарадком, вёска ажыла.

стар. 5